**А.В. Солахаў, А. І. Шышова (Мазыр, Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна)**

## РАЗВІЦЦЁ ДЫЯЛАГІЧНАГА МАЎЛЕННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Узровень развіцця дыялагічнага маўлення малодшага школьніка – гэта найлепшы паказчык яго маўленчай культуры і выхаванасці. Дыялагічнае маўленне спрыяе звязнасці маўлення, яго паслядоўнасці, развіццю ўмення размаўляць на беларускай мове у залежнасці ад абставін у розных стылях. ―Камунікатыўная здольнасць – прыродная адоранасць чалавека да зносін, з аднаго боку, і камунікатыўная прадукцыйнасць – з другога. Галоўная мэта актывізацыі зносін – фарміраванне камунікатыўнай актыўнасці вучняў, пры якой назіраецца пошук нестандартных спосабаў рашэння камунікатыўных задач, гнуткасць і мабільнасць спосабаў дзеяння, пераход да творчай дзейнасці‖ [1, 150].

Вялікая ўвага развіццю дыялагічнага маўлення малодшых школьнікаў павінна ўдзяляцца на ўроках беларускай мовы. На жаль, у падручніках па беларускай мове для пачатковай школы дыялагічныя тэксты сустракаюцца рэдка. Праца па развіцці маўлення з такімі тэкстамі ў большасці выпадкаў належным чынам не плануецца. Так, у практыкаванні № 154 прапануецца толькі выразна прачытаць верш М. Гелер:

– Што, сябры, для жыта трэба? – А для казкі?
– Ну, вядома, трэба глеба. – Цішыня.
– А для птушкі? – Ну, а што для весялосці?
– Вышыня. – Каб часцей бывалі госці!

Далей увага вучняў акцэнтуецца толькі на знаках прыпынку ў канцы выкарыстаных сказаў і колькасці слоў у іх [2, ч. 2, с. 90–91]. Вопытны настаўнік прапануе прачытаць гэты тэкст па ролях і нават праінсцэнаваць яго – прыѐ мы працы, якія заўсѐ ды выклікаюць актыўнасць вучняў. Чытаць па ролях могуць усе вучні адразу: адзін вучань, які сядзіць за партай, задае пытанні, сусед адказвае на іх – і так за ўсімі

МГПУ им. И.П.Шамякина

партамі. Потым вучні мяняюцца ролямі. Гэтак жа можна выкарыстаць на ўроках практыкаванні №№ 169 [2, ч. 1, с. 87], 225 [3, ч. 1, с. 115–116], 79 [3, ч. 2, с. 45] і інш.

Толькі ў некаторых практыкаваннях увага скіроўваецца на правядзенне творчай працы з дыялогамі. Напрыклад, трэцякласнікам прапануюцца дыялогі (практыкаванні № 107 і 128), па ўзоры якіх вучню неабходна задаць пытанне суседу па парце, а той павінен адказаць або скласці дыялог самастойна:

– Колькі зараз часу?

– Дзве гадзіны дваццаць мінут.

– А каторай гадзіне пачнецца фільм? – А палове першай [4, ч. 1, с. 62]; – Жадаю табе вясѐ лых канікул!

– Шчыры дзякуй! І я табе таксама! [4, ч. 1, с. 74].

У большасці выпадкаў той матэрыял, які падаецца ў падручніках, можна з поспехам выкарыстоўваць для развіцця дыялагічнага маўлення, калі дапоўніць яго адпаведнымі заданнямі.

Пры выкананні, напрыклад, практыкавання № 17, у якім змешчаны дыялог ―Жарт‖ , другакласнікам трэба прачытаць і адказаць на пытанне, ці правільна хлочык зразумеў маму:

– Чаму ты ні з кім не вітаешся?

– Мама казала, што трэба адзін раз на дзень вітацца. Раніцай я вітаўся з дзядзькам Лявонам [5, ч. 1, 11].

Пасля выканання задання настаўнік можа прапанаваць вучням прачытаць тэкст па ролях і таму, хто будзе чытаць першую рэпліку, працягнуць дыялог, растлумачыўшы памылку хлопчыка, напрыклад:

– Ты няправільна зразумеў маму. Трэба вітацца па аднам разе з кожным.

Да гэтага дыялогу можна таксама прыдумаць вуснае абрамленне. Дапамогуць у гэтым пытанні:

– Калі і дзе магла адбыцца гэта размова?

– Хто спытаўся ў хлопчыка?

На аснове змешчаных у падручніках па беларускай мове практыкаванняў можна таксама рэкамендаваць:

1) рэканструяванне тэксту з апусканнем слоў аўтара. Для гэтага, напрыклад, падыдзе практыкаванне № 32 [5, ч. 1, 17]. Пасля таго як вучні прачытаюць увесь тэкст і адкажуць на пытанне, за што і калі дзякуюць людзям, настаўнік прапануе вучням прачытаць тэкст па ролях, апускаючы словы аўтара. Для гэтага ѐ н прызначае вучняў, якія будуць чытаць словы бабулі, Максімкі і Сярожы.

Ма кс імка. Дзякуй!

Баб уля. Расці вялікі. А ты, Сярожа, чаму не дзякуеш?

Сяро жа. Навошта дзякаваць? Я ж дома.

Баб уля. Дзякуй – тое слова, якое ўсе добрыя людзі кажуць. Мне дзякуй, што накарміла вас, а Максімку за тое, што прыйшоў у госці. Кожнаму трэба паважаць чужую працу, чужую ласку.

Сяро жа. Дзякуй, дарагая бабуля.

Баб уля. На здароўе, унучак;

2) аднаўленне прапушчаных пытальных сказаў па адказах у размове бабулі з унукам (практыкаванне № 105) [4, ч. 1, с. 61];

МГПУ им. И.П.Шамякина

3) аднаўленне асобных рэплік дыялогу. Для гэтага падыходзіць дыялог з практыкавання № 193, у якім апушчаны асобныя рэплікі, замест якіх пастаўлена шматкроп‘е [5, ч. 2, 115]. На жаль, у падручніку нічога не гаворыцца пра аднаўленне рэплік. Пра гэта павінен сказаць настаўнік;

4) прыдумванне дыялогу па ўзору. Узорам можа служыць дыялог з практыкавання № 28, у якім раскрываецца знаѐмства хлопчыка з кіраўніком гуртка [5, ч. 2, 115]. Для арганізацыі творчай працы і замацавання ведаў настаўнік прапануе хлопчыкам прыдумаць размову з кіраўніком спартыўнай секцыі, а дзяўчынкам – з кіраўніком хору;

5) прыдумванне дыялогу па прадметных малюнках, для чаго можна выкарыстаць практыкаванне № 87, якое прапануецца выканаць у форме пытанняў аднаго вучня і адказаў другога [4, ч. 2, с. 87]:

– Што робіць вавѐрка? – Што робіць вавѐрка?
– Вавѐрка сушыць грыбы. – Вавѐрка сушыць грыбы.
– Што робіць дзяўчынка? А што робіць дзяўчынка?
– Дзяўчынка малюе кветкі. – Дзяўчынка малюе кветкі. Што – Што робіць лебедзь? робіць лебедзь?
– Лебедзь плавае ў возеры. – Лебедзь плавае ў возеры.

У практыкаванні 142 [3, ч. 1, с. 76] змяшчаюцца загадкі, а адгадкі падаюцца на прадметных малюнках: дзяцел, парасон, рамонак, іголка з ніткай. Адзін вучань будзе задаваць пытанні, а другі на іх адказваць. Затым яны мяняюцца ролямі. Пытанні паўтарацца не павінны. Напрыклад:

– Што робіць дзяцел? – Дзе жыве дзяцел?
– Дзяцел лечыць дрэва. – Дзяцел жыве ў лесе.
– Для чаго выкарыстоўваецца – У які дзень патрэбен парасон?
парасон? – Парасон патрэбен у дажджлівы
– Пад парасонам хаваюцца ад дзень. дажджу. – Дзе расце рамонак?
– Якога колеру пялѐсткі-раснічкі ў – Рамонак расце на полі. рамонка? – Без чаго іголкай нічога не
– Пялѐсткі-раснічкі ў рамонка пашыеш?
белыя. – Іголкай нічога не пашыеш без
– Што робяць іголкай? ніткі.
– Іголкай шыюць.

Такія пытанні вучні могуць падрыхтаваць дома;

6) складанне дыялогу паводле малюнка. Так, у практыкаванні № 188 змешчаны малюнак і пытанні да яго [3, ч. 1, с. 98]. Для працы на ўроку можна выкарыстаць гульню: адзін вучань задае пытанне, а другі адказвае на яго;

7) арганізацыя дыялогу-гульні. У практыкаванні № 59 прапануецца гульня ―Які? Якая? Якое? Якія?‖ [4, ч. 2, с. 32]. Такія ж дыялогі-гульні можна правесці, адказваючы на пытанні ―Што значыць слова..?‖ (для яе правядзення настаўнік можа прапанаваць спіс слоў з ярка акрэсленай унутранай будовай слова, напрыклад: *спартсмен, футбаліст, баяніст, кацяня, сарачаня, сунічнік, рабіннік* і інш.), ―Што робіць?..‖ , ―Дзе расце (водзіцца)..? і інш.

Акрамя названых вышэй прыѐмаў працы, можна выкарыстаць наступныя:

МГПУ им И.П.Шамякина

1) выбар з 2–3 прапанаваных рэплік адной, якая адпавядае па сэнсе дадзенай;

2) складанне дыялогу з рэплік, якія трэба паставіць у пэўным парадку. Напрыклад:

*– З бацькамі.*

*– Ці ездзіў ты гэтым летам на мора?*

*– Вельмі.*

*– Купаліся часта?*

*– А з кім?*

*– Вядома, ездзіў.*

*– Адпачынак на моры табе спадабаўся?*

*– Па два разы на дзень*;

3) прыдумванне дыялогу паміж указанымі асобамі: настаўніка і вучня, бібліятэкара і наведвальніка бібліятэкі; удзельніка экскурсіі і экскурсавода, прадаўца і пакупніка; трэнера і спартсмена; кандуктара і пасажыра; урача і хворага;

4) арганізацыя інтэрв‘ю, калі адзін вучань задае пытанні другому (Дзе адпачываў летам? Што там рабіў? Ці падабалася табе? І інш.), а той адказвае на іх. Потым яны мяняюцца ролямі. Можна таксама арганізаваць інтэрв‘ю ―карэспандэнта‖ з ―дырэктарам школы‖ , ―урачом‖ , ―лѐ тчыкам‖ , ―вядомым спартсменам‖ і г. д.

Адзначаныя прыѐ мы працы па развіцці дыялагічнага маўлення малодшых школьнікаў, як паказваюць апытанні вучняў, вызначаюцца сваѐ й эфектыўнасцю і актывізуюць дзейнасць школьнікаў на ўроку.

**Літаратура**


1. Лойка, М. І. Некаторыя прыѐ мы фарміравання камунікатыўных кампетэнцый малодшых школьнікаў / М. І. Лойка, А. М. Лапкоўская // Социализация личности на разных этапах возрастного развития: опыт, проблемы, перспективы: материалы I респ. науч. конф., Гродно, 25–26 октября 2012 г. / ГрГУ им. Я. Купалы; редкол.: Н. В. Михалкович (гл. ред.) [и др.]. – Гродно: ГрГУ, 2012. – С. 150–153.
2. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова: вучэб. дапам. для 2 кл. агульнааадукац. устаноў з рус. мовай навучання: у 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010. – Ч. 1–2.
3. Красней, В. П., Беларуская мова: падручнік для 3-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання: у 2 ч. / В. П. Красней. – 2-е выд., перапрац. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2012. – Ч. 1–2.
4. Валынец Т. М., Беларуская мова: падручнік для 3-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі, з рус. мовай навучання: у 2 ч. / Т. М. Валынец [і інш.]. – 2-е выд., выпраўл. і дап. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2012. – Ч. 1–2.
5. Паўлоўскі, І. І., Беларуская мова: вучэб.дапам. для 2 кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання: у 2 ч. / І. І. Паўлоўскі, Л. Ф. Леўкіна. – Мінск: НІА, 2006. – Ч. 1–2.


МГПУ им. И.П.Шамякина